Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 2 (643). Wilnia, Čaćwier 16 Studzienia 1936 h. Hod XII (XX)

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.

HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.

Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Składka u hod 4 zał., na pałhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

На украінска-польскім фронце без перамен

У мінулым годзе ўкраінская партыя УНДО, на супроць іншых украінскіх палітычных кірункаў, пайшла на ўгоду з польскім урадам. Аб гэтым факце пісалі мы ў «Бел. Крыніцы» нешта разы два, дзе выказвалі ня столькі сваё зьдзіўленьне, сколькі сумніў, каб з такой угоды ці што дарэчнае вышла. На наш пагляд ундаўска-польская ўгода — гэта не палітычны факт, аблічаны на далёкую будучыню, які пачне новую эру ў украінска-польскіх адносінах, а хутчэй толькі перадышка. Так яно й ёсьць сапраўды. Вось ужо прайшло больш паўгода ад гэнай угоды, а на украінска-польскім фронце ўсё асталося без перамен.

Угода пачалася ад выбараў у Сойм. Ужо тады аказалася, што украінская старана прырачэньняў сваіх датрымала, а польскае грамадзянства не. Было з гэтага відаць, што да разьвязкі украінска-польскай праблемы ня дойдзе. Далейшае жыцьцё гэта пацьвердзіла цалком.

У канцы мінулага году ў Варшаве выплыў працэс украінскіх тэрорыстаў незалежнікаў. На украінска-польскім фронце паказалася ажыўленьне, неспакой. З боку польскага паявіліся галасы аб патрэбе пазытыўнай разьвязкі украінскай справы для дабра самай Польшчы. Так напр. у „Wiadomościach Literackich“ з дня 15.XII.35 паявіўся артыкул М. Прушынскага: „Zagadnienie ukraińskie w Polsce“, у якім аўтар салідна даказвае, што з боку польскага мусяць быць для украінцаў вялікія ўступкі, бо толькі гэткай дарогай можна наладзіць добрыя адносіны між двума народамі. Зрабіць гэта — кажа той-жа Прушынскі ў канцы свайго артыкулу — трэба тым больш, што аднэй з галоўных прычын з боку УНДА ўгоды з палякамі «была цэнтралістычная, антыукраінская палітычная лінія Расеі над Дняпром, самагубства Скрыпныка і Хвылёваго, трагедыя галіцыйскай сям'і Крушэльныцькых» і што цяпер — канчае Прушынскі — «у добра паінфармаваных украінскіх сфэрах гаворыцца аб праектаванай быццам зьмене курсу на Украіне наддняпроўскай, выкліканай непакоем бальшавікоў тым, што цяпер дзеецца ў Усходняй Малапольшчы».

А вось яшчэ з нагоды таго-ж працэсу над сябрамі УНО закрануў справу украінска-польскіх адносін пракурор Рудніцкі ў сваей аскаржаючай прамове. Прамоўца клаў націск на тое, што паразуменьне украінцаў з палякамі і павінна прысьці, але толькі на падставе ўзаемнага прызнаньня і супрацоўніцтва.

Узноў-жа „Bunt Młodych“ з дня 20.XII—5.I.36 зьмяшчае гутарку таго-ж М. Прушынскага з лідэрам украінска-польскай угоды В. Мудрым. З гутаркі гэтай даведваемся так-жа, што галоўнымі прычынамі ўгоды была тэрорыстычная дзейнасьць УНО і антыукраінская палітыка Саветаў, якія цяпер ужо быццам рыхтуюцца, казаў В. Мудры, зьмяніць свае адносіны да украінцаў на лепшыя. З гэтага вынікае, што палякі павінны зусім пазытыўна адносіцца да патрэбаў украінскага народу ў Польшчы, каб угода магла мець сэнс свайго існаваньня.

Тымчасам з боку польскага гутарак многа, а дзела як ня было, так і няма. Урэшце ў «Діле» з дня 5.I.1936 спатыкаем артыкул др. Ст. Барана «На фронце бяз зьмен», у якім, прааналізаваўшы ўгоду, яе гісторыю і цяперашні яе стан, аўтар кажа даслоўна: «Мусіць наступіць санацыя й псыхічнае адпружаньне на польскім баку фронту. Покульшто яе яшчэ няма — і таму палажэньне на польска-украінскім фронце бяз зьмен!».

І гэта можна было лёгка прадбачыць. Здаецца нам, што разумелі гэта добра й самі украінскія тварцы ўгоды з палякамі і надта магчыма, што разважалі гэну ўгоду й разважаюць яе сяньня толькі як перадышку.

Найбольш урэшце ў гэтым усім сяньня цікава тое, што быццам бальшавікі мяняюць свой праціўукраінскі курс на курс пазытыўнай нацыянальнай палітыкі. Калі-б так было сапраўды, дык гэта толькі прысьпяшыла-б вырашэньне украінскай праблемы ў яе найшырэйшых рамках. А гэта мела-б, ясная рэч, рашучае так-жа значэньне і для беларускай праблемы.

БЕЛАРУСЫ! Прысылайце ахвяры на фонд беларускай асьветы!—Пашырайце беларускае друкаванае слова. — Навучайце дзяцей чытаць і пісаць пабеларуску!

24036

Наступ латыскага нацыяналізму на Беларусаў

Беларуская адраджэнска-вызвольная думка расьце і магутнее. Расьце ўсюды, гдзе ёсьць беларускі народ, гдзе Беларусы пражываюць. Пад Латвіяй, гдзе знаходзіцца да 170-ці тысячаў Беларусаў (паводле аблічэньняў Беларусаў), — беларускае адраджэнска-вызвольнае жыцьцё выражаецца там, паміж іншым, у розных беларускіх грамадзка-палітычных і культурна-асьветных арганізацыях і ўстановах.

З пасярод гэных арганізацыяў і ўстаноў, многія праяўлялі вялікую жыцьцёвасьць і мелі добрыя пэрспэктывы свайго разьвіцьця.

Беларусы ў Заходняй Беларусі (што знаходзіцца ў межах Польскай дзяржавы), ня мала цешыліся з беларускага жыцьця ў Латвіі. Цешыліся ў асобнасьці мы — з БХД. і яе прыхільнікі.

Але ад 15.V.34 г: беларуская радасьць пераходзіць у сум. Ад гэтай даты „Б. Крыніца“ усьцяж рэеструе факты ліквідацыі беларускага жыцьця ў Латвіі. Латыскія нацыяналісты дайшоўшыя ў гэты дзень да ўлады шляхам перавароту надаюць свой нацыяналістычны тон усяму жыцьцю ў дзяржаве. І ад гэтага „тону“ — найбольш пацярпелі Беларусы. Беларускае палітычнае жыцьцё ў Латвіі афіцыяльна ўжо зьліквідавана, беларускае грамадзка-эканамічнае і культурна-асьветнае жыцьцё ўжо часткова зьліквідавана і знаходзіцца далей у стадыі ліквідацыі.

Паводле апошніх вестак (канец 1935 г. і пачатак сёлетняга году)— а гэтыя весткі не ахапляюць цэласьці беларускай справы ў Латвіі і не ілюструюць стану фактычнага ў паўнаце,—беларуская справа прадстаўляецца так.

Беларускае школьніцтва пачатковае.

У Люцынскім павеце няма ні аднэй школы, апошняя зачынена у 1935 навучальным годзе; у Дзьвінскім павеце: а) Пустынская вол. —школы няма, апошняя зачынена ў 1935 н. г., б) Скайсьценская вол. — бел. школы няма, апошняя зачынена ў 1935 н. г., в) Прыдруйская вол. — існуюць чатыры бел. школы; горад Дзьвінск — існуе адна школа, Рыга—тры і адна вячэрняя дадатковая. Тут гутарка аб школах беларускіх дзяржаўных. З прыватных школ — у Рызе — Торэнсбэрская зьліквідавана.

Беларускае сярэдняе школьніцтва.

Беларускай гімназіі няма аніводнай: Рыская (прыватная) зачынена ў 1935 г., з Дзяржаўнай беларускай гімназіі ў Дзьвінску утвораны беларускі камплект пры г. зв. II Дзьвінскай Дзяржаўнай (латыскай) гімназіі. Вучыцельскія курсы ў Рызе зьліквідаваны.

Беларускія культурна-асьветныя і эканамічныя арганізацыі і ўстановы.

„Таварыства Беларускай Моладзі ў Латвіі“ (цэнтраля ў Рызе, аддзелы на правінцыі) — налічала каля тысяча сяброў — зачынена, „Прасьвета“ зьліквідавана, „Аратай“ зьліквідаваны, „Дзьвінская пазычкова-ашчадная каса“ зачынена, «Таварыства Беларуская Хата“ ў канцы 1935 г. загадам віцэміністра ўнутраных спраў А. Бэрдзіна прымушана ліквідавацца. Чатыры аддзелы гэтага т-ва на правінцыі ўжо ліквідуюцца.

Захады перад уладамі ігнаруюцца.

Беларусы ў Латвіі, у сувязі з наступам латыскага на іх нацыяналізму, апынуліся ў становішчы нячувана цяжкім.

Іхныя захады перад адпаведнымі ўладамі гэтымі ўладамі ігнаруюцца. Улады — ад нішэйшых чыноўнікаў да самога адказнага кіраўніка дзяржавай, „дыктатара“ Ульманіса *нават ...ня прыймаюць дэлегацыяў ад Беларусаў.* Вось факты—прыклады: у канцы 1935 г. рыскі гарадзкі галава (прэзыдэнт места) Гарсэліс ня прыняў беларускай дэлегацыі ад „Т-ва Беларускіх Вучыцялёў“ у справе дапамогі рыскаму дзіцячаму саду. Адміністрацыйныя дзяржаўныя і самаўрадавыя, галоўным чынам школьныя ўлады ў Рызе, агулам нэгатыўна адносяцца да Беларусаў і іх справы. У асобнасьці нэгатыўна да справы беларускай адносіцца кіраўнік асьветнага аддзелу Рыскай гарадзкой управы гр. Віг. Сам-жа прэм'ер ураду К. Ульманіс у 1935 г., калі да яго зьвярнулася беларуская дэлегацыя ў справе школьнай —дэлегацыі ня прыняў, а сказаў толькі:—„што-ж там яны будуць гаварыць, калі што маюць, хай напішуць“!

Адным словам, палітычны курс латыскага нацыяналізму проціў Беларусаў абвостраны, жорсткі. Ён выражаецца нават і ў адносінах уладаў да Беларусаў.

Жыве беларушчына і разьвіваецца.

Вышэй пададзены канкрэтны, фактычны матарыял,— а гэта-ж толькі частка! — не патрабуе шырокіх комэнтараў.

Латыскі нацыяналізм спужаўся беларушчыны і аб'явіў проціў яе паход. —Спужаўся працэсу ўзросту беларушчыны пад Латвіяй. Сярод беларускага працоўнага сялянства, і нават такога бел. працоўнага сялянства, якое дзеля тых ці іншых прычын запісвалася „Латышамі,“— знаходзяцца адзінкі вельмі сьведамыя і моцныя беларускім духам. Яны зьяўляюцца ў некаторай меры кіруючымі дзейнікамі беларускага жыцьця пад Латвіяй, і працуюць там позытыўна.

Ясная рэч, выключаюцца тут беларускія элемэнты угадовыя (гдзе іх няма!), якія зьяўляючыся служкамі латыскага нацыяналізму за срэбнікі праводзяць сваю подлую работу.

* * *

Крытычны чытач беларускі дагледзіць вялікую рожніцу паміж палажэньнем Беларусаў пад Латвіяй і палажэньнем Беларусаў у нас, у Заходнай Беларусі. Прадусім цыфры - прыклады. Паводле латвійскага пераліку насельніцтва, з 1935 г., Беларусаў пад Латвіяй — 26.867, у Заходняй Беларусі, паводле польскага перапісу з 1931 году — **1.600.000** Беларусаў.

Беларускае школьніцтва пад Латвіяй, як бачымо з вышэй пададзенага матарыялу, яшчэ існуе. Ёсьць

колькі дзяржаўных беларускіх школ. У Заходняй Беларусі —...няма гутаркі. Ёсьць тут беларуская філія польскае дзяржаўнае гімназіі Славацкага ў Вільні. Ёсьць толькі 69 польскіх школ, у якіх паводле віленскага школьнага куратара „język białoruski uwzględniony.“ (Kurjer Wilenski z dn. 26.XI.35 h.). (Тут дадаткова падаю, што Віленская Школьная Кураторыя (Вокруг) абымае ваяводзтвы: Віленскае, Навагрaдзкае і Усходнюю часьць Беластоцкага; у вокругу ўсіх дзяцей у школьных гадох — паводле куратара — 483.049, з іх вучыцца 416.876 (86,1 проц.), ня вучыцца 66.993 (13,9 прац.), на 390.000 дзяцей у публічных школах паводле тагож куратара ёсьць 128.740 дзяцей, каторых роднай мовай ёсьць мова беларуская). Паданыя ў дужках цыфры адносяцца, як сказана, да віленскага школьнага вокругу, а не да іншых, гдзе знаходзяцца так-жа Беларусы; пры гэтым гэныя цыфры падаў куратар. І гэта трэба мець на ўвазе!

На гэтым кончу параўнаньне...

* * *

Так прадстаўляецца беларуская справа, у фрагмэнтарычным апісаньні, беларуская справа пад Латвіяй і... у нас, у Заходняй Беларусі.

Сумна, але не безнадзейна...

Ш. І.

Prysud ŭ wialikim palityčnym ukrainskim pracesie UON u Waršawie

U Waršawie palityčny praces OUN., jaki pačaŭsia 18 listapada 1935 h. i ab katorym my pisali ŭ kožnym numary „B. Krynicy“ praz uwieś čas pracesu, — zakončyŭsia 13 h. m.

Padsudnyja ŭ hetym pracesie ŭsie ukraincy.

Akt abwinawačańnia dakazwaje, što ŭsie padsudnyja byli ŭ nielehalnaj ukrainskaj arhanizacyi OUN (Orhanizacyja Ukrainskich Nacyjanalistaŭ) i što jany brali ŭčaście, niekatoryja biezpasredna, a niekatoryja pasredna, u zabojstwie ministra Pierackaha ŭ Waršawie.

Waršaŭski Akružny Sud razhledziŭšy hetuju wialikuju sprawu, padčas razhladu katoraj patrebawaŭ ad padsudnych i niekatorych świedkaŭ ukraincaŭ, kab hawaryli pa polsku, a nie paŭkrainsku, *dnia 13 h. m. wydaŭ prysud, jakim zasudziŭ:*

1) Ściapana Banderu, 26 hadoŭ, Mikałaja Łebeda, 25 hadoŭ, i Jarasława Karpynca, 30 hadoŭ, — *na karu śmierci*, zamianiajučy hetuju karu, pawodle amnestyi, na wiečnuju katarhu;

2) Mikałaja Kłymyšyna, 36 hadoŭ, i Bahdana Pidhajnaha, 31 h., — na wiečnuju katarhu;

3) Darotu Hnatkiwsku, 23 h., — na 15 hadoŭ katarhi;

4) Aŭhienia Kačmarskaha, 25 h., Ramana Myhala, 24 h. i Iwana Malucu, 26 h., — pa 12 hadoŭ katarhi;

5) Kaciarynu Zaryckuju, 21 h., — na 8 hadoŭ katarhi;

6) Jakuba Čornija, 28 h. i Jarasława Raka, 27 h., — pa 7 hadoŭ katarhi.

Paśla pračytańnia prysudu zasudžanyja Bandera i Łebed paukrainsku niešta adazwalisia, za što ich sud wydaliŭ zaraz-ža z sali.

Abarona padaje apelacyju.

Da usich hurtkoŭ Bieł. Instytutu Hasp. i Kultury

Centralny Urad Bieł. Instytutu prypaminaje ŭsim hurtkom Instytutu ab abawiazku prysyłańnia sprawazdač z dziejnaści za 1935 hod pawodle farmulara z prošłych hadoŭ. Sprawazdačy pawinny być prysłany da 29 lutaha h. h.

Ab pierawybarach uradu hurtka, ab źmienach u ŭradzie abo ab zaćwierdžańni staroha ŭradu treba pawiedamić starastwa ŭ praciahu 2 tydniaŭ. U praciŭnym wypadku starastwa mahło-b nałažyć na hurtok štraf u administracyjnym paradku.

Centralny UradBIHiK.

Wilnia, 10.I.36.

Wialiki palityčny praces u Wilni

Abwinawačanyja asystenty i studenty U. S. B. — Palaki, Biełarusy, adzin Litowiec i adzin Žyd.

U sieradu 8 h. m. u Wilenskim Akružnym sudzie pačaŭsia palityčny praces, jaki zakončany prysudam 13.I.

Na ławie abwinawačanych zasieli: Jan Kiejstut Drutto, asystent ziemlarobskaha fakultetu U.S.B., 26 hadoŭ, Litowiec. Marja Dziewickaja, 20 hadoŭ, studentka, Polka. Boruch Liwšyc, 22 hadoŭ, student, Žyd. Mikałaj Urbanowič 21 h., student, Biełarus. Marcin Ščekała, 22 h. stud., Biełarus. Aleksandar Smal, 23 h., student, Biełarus. Petrusewič Kazimier, 29 h. asystent zoolohii, Palak. Okołowič Wincenty, 19 h., asystent meteorologii, Palak. Dziewickaja Irena, 28 h., absolw. medycyny, Polka. Jendrychowski Ściapan, 25 h., mahistr prawa, Palak. Štachelski Jury, 24 h., asystent medyc., Palak.

Akt abwinawačańnia stawić u winu abwinawačanym, što jany mieli na mecie ŭ swajej palityčnaj dziejnaści, jakuju prawodzili ŭ Wilni siarod studentaŭ h. zw. supolnym frontam „Lewicy Akademickaj,“ a tak-ža siarod rabotnikaŭ u Wilni i na ŭsiej terytoryi Zach. Biełarusi, u parazumieńni z nielehalnaj Kamunistyčnaj Partyjaj Zachodniaje Biełarusi — siłaj źmianić u Polščy hramadzki ład i Zach. Biełaruś adarwać ad polskaj dziaržawy.

Prakuror Piatroŭski padtrymliwajučy akt abwinawačańnia staraŭsia dakazać, što ŭsie padsudnyja, heta kamunistyčnyja dziejačy, bo ichniaja dziejnaść, pawodle dokazaŭ prakurora, zusim padobnaja da dziejnaści kamunistyčnaj — KPZB. Kamunisty Wilenščynu zaličajuć da Zach. Biełarusi, kazaŭ prakuror. Nazywajuć Wilenščynu krajem Zach. Biełarusi i padsudnyja.

Abarona i padsudnyja, asabliwa padsudny Jendrychowski, wyjaśnili, što nia hledziačy na bolšaść biełaruskaha nasielnictwa ŭ Wilenščynie, u Wilenskim uniwersytecie, adnak, biełarusaŭ studentaŭ nadta mały pracent, bo biełarusy, dziela swajej biednaści matarjalnaj, nia mohuć wučycca ŭ uniwersytecie.

Sud razhladzieŭšy sprawu, apytaŭšy bolš sotni świedkaŭ, wysłuchaŭšy abwinawačańniaŭ prakurora, pramowaŭ abarony, a tak-ža wyjaśnieńniaŭ padsudnych, 13 h. m. wydaŭ prysud, jakim *zasudziŭ*.

1) Jana Kiejstut-Drutto (Litowiec) na 5 hadoŭ wastrohu, źmianšajučy karu pawodle amnestyi na 2 hady i 6 miesiacaŭ;

2) Aleksandra Smala (Biełarus) na 3 hady wastrohu, źmianšajučy karu pawodle amnestyi na 1 hod i 6 miesiacaŭ i

3) Borucha Liwšyca (Žyd) na 3 hady, źmianšajučy karu pawodle amnestyi na 1 hod i 6 miesiacaŭ.

Usich inšych padsudnych sud apraŭdaŭ. Abarona zasudžanych z swajho boku, a prakuror z swajho— padajuć apelacyju. Zasudžanych pamiaścili ŭ wastrozie na Łukiškach.

Hety sud wyjawiŭ, što siarod polskaj moładzi prachodzić praces psychičnaha pierałomu ŭ bok pryznawańnia niedziaržaŭnych narodaŭ našaha kraju i pryznawańnia im należnaha prawa. Słowam, praces pakazaŭ, što maładaja polskaja gieneracyja maje ŭ swaich radoch, u sensie pryznawańnia niedziaržaŭnych narodaŭ, u tym liku i Biełarusaŭ: „hercenaŭcaŭ“ i „bakunincaŭ“ — „jendrychoŭščykaŭ“ i „dembinščykaŭ.“

Wystaŭka mastackaj tworčaści Piotry Sierhijewiča

Z pasiarod biełaruskich mastakoŭ u Zachodniaj Biełarusi (Čuryły Kuźmy, Sieŭruka M., Drazdowiča J., i inš.) adno z pieršych miesc na niwie mastactwa, dziela kolkaści i jakaści tworaŭ zajmaje Piotra Sierhijewič.

Biazsprečny talent jahony znachodzicca jašče ŭ stadyi raźwićcia i ŭściaž mahutnieje. Dokazam hetaha— wystaŭka tworčaści mastaka, jakaja pačałasia 28.XII.35 i trywała da 8-ha h. m. Wystaŭka abymała takija widy i charaktar tworaŭ: malawanyja, alejnyja abrazy, z pasiarod jakich 15 kampazycyjaŭ, 20 partretaŭ, rešta krajawidy — pejzažy; rysunki wykananyja sangwinaj čornaj i čyrwonaj — u liku 40, — pierawažna škicy (narysy) hałoŭ; wokładki da časapisaŭ i knižak — u linarycie i cynkagrafičnyja; prajekty polichromii kaściołaŭ — wykananyja akwarelaj (kaścioły ŭ Sołach, Ašmianskaha paw. i Koracu na Wałyni). Usio tworstwa za piać apošnich hod — ad 1930 da 1935 h.

Piotra Sierhijewič, choć isnuje h. zw. wilenskaja škoła prafesara Ślendzinskaha (reprezentujučy kirunak neoklasycyzmu), da jaje nie naležyć i u swaim tworčym šlachu idzie samastojna. Biohrafičnyja elementy i nacyjanalnaje „ja“ Piotry Sierhijewiča — ščyry biełaruski patryjotyzm, kroŭnaja i duchowaja łučnaść z biełaruskaj narodnaj masaj, zachopleńnie biełaruskimi adradženska-wyzwolnymi ideałami, i zachopleńnie mastakom biełaruskaj pryrodaj, —znajšli wyražeńnie ŭ jaho tworčaści.

Charakterna, što aŭtary recenzijaŭ wystaŭki padanyja wilenskimi polskimi časapisami ani čuć nia ŭspomnili ab nacyjanalnym abliččy P. Sierhijewiča. Tolki ŭ wilenskim „Słowie“ źjawiłasia zaciemka, jakoj aŭtar zastasawaŭ padychod charakterny, bo šukajučy praŭdy — zamiest „biełaruski“ ŭzywaŭ nazoŭ „miascowy“, „regijonalny“, „tutejšy“, choć i hetym zbliziŭsia da prawilnaści aceny tworaŭ našaha mastaka.

Arhanizawaŭ wystaŭku samatužna sam mastak.

J. Šutowič.

„КАЛОСЬСЕ“ за 1935 год

Пад загалоўкам „Калосьсе“ выходзіць у Вільні літаратурна-навуковы часапіс. Выходзіць раз у тры месяцы. Афіцыяльным выдаўцом яго зьяўляецца Бел. Інстытут Гаспадаркі і Культуры. Фактычна часапіс выдаецца пераважна са складак, зьбіраных спасярод беларускага грамадзянства.

Рэдагуе „Калосьсе“ рэдакцыйная калегія, у склад якой уваходзяць: М. Шкялёнак, Ад. Станкевіч, М. Пяцюкевіч, А. Бярозка і Я. Шутовіч. Рэдагуецца часапіс старанна. Вялікая ўвага зварачваецца як на адпаведны зьмест, так на карэкту і на зьверхні выгляд. Дзякуючы ўсяму гэтаму часапіс выклікае ў чытача прыемнае ўражаньне.

Патрэба ў беларускім грамадзянстве літаратурна-навуковага часапісу адчувалася даўно. Ужо некалькі гадоў Бел. Інстытут Гасп. і Культуры быў пастанавіўшы прыступіць да выдаваньня падобнага часапісу. Розныя аднак перашкоды псулі яго добрыя намеры. Урэшце, у мінулым годзе, перашкоды былі пераламаны і ў сьвет паказаўся беларускі літаратурна - навуковы журнал „Калосьсе“. Год пратрываў ён памысна і памысна прыступае да працы ў сёлетнім — для яго другім — годзе. Астаецца толькі пажадаць, каб як выдаўцы, так і рэдактары «Калосься», як адзінага ў Зах. Беларусі падобнага часапісу, памысна вялі сваю працу далей. Усё тут залежа ад ідэовасьці і ад вытрымаласьці. А гэтага ў беларусаў трэба якнайбольш. У нас кожнае ідэовае пачынаньне напатыкае часта нязвычайныя перашкоды. Ідуць яны пераважна праз „сваіх“, але ад нашых ворагаў. Сёетое ў гэтым кірунку ўжо робіцца і проціў „Калосься“, ужо чувацца аб нейкіх іншых, конкурэнцыйных выдавецтвах, чувацца аб дывэрсыйнай рабоце проціў гэтага часапісу і інш. падобныя рэчы. Вось-жа на гэта ўсё „Калосьсе“ непавінна зварачваць найменшай увагі, а далей ісьці сваей дарогай, верачы, што ўсе ідэовае і чэснае ў беларусаў працу гэтага часапісу і ўсе яго ідэовыя намеры належна ацэніць і падтрымае, аб чым у значнай меры судзіць можна ўжо.

Дагэтуль „Калосься“ вышла чатыры сшыткі. Гэты лік дае ўжо магчымасьць бліжэй прыглядзіцца да яго і выдаць аб ім адпаведны суд. Вось-жа трэба сказаць, што часапіс гэты і свае намеры і надзеі грамадзянства апраўдаў. Стаўся ён у Зах. Беларусі сапраўдным асяродкам беларускай літаратуры і навукі.

На бачынах „Калосься“ знайшлі сабе месца выдатныя беларускія паэты з Зах. Беларусі, як М. Машара, Н. Арсеньнева, Х. Ільяшэвіч, пачынаючы, але таленавіты, А. Бярозка і інш., а так-жа пачынаючыя прозаікі А. Чэмер і Вік Рэно. На бачынах таго-ж „Калосься“ зьмяшчаюцца так-жа лепшыя творы, як перадрукі, паэтаў і пісьменьнікаў з Усходняй Беларусі, каб знаёміць беларускае грамадзянства з цэласьцяй беларускага прыгожага пісьменства і каб украпляць у ім пачуцьцё нацыянальнай еднасьці і духовай салідарнасьці.

Дадатна трэба так-жа ацаніць «Калосьсе» за мінулы год і з боку яго працы навуковай. Магістар Я. Шутовіч, першы на падставе архівальнага матар'ялу асьвятліў нам асобу беларускага рэвалюцыянэра і паэта Адама Гурыновіча, Ад. Станкевіч, першы пазнаёміў беларускае грамадзянства з беларускім рухам народавольскім на падставе часапісу «Гомон», а так-жа першы даў грунтоўныя нарысы аб Каліноўскім і Шыпіле, др. Ст. Грынкевіч даў пару глыбокіх ідэолёгічных артыкулаў аб беларускай культуры, др. Я. Станкевіч пазнаёміў нас упершыню аб Севяранах, як беларускім племі, інж. Ад. Клімовіч на падставе архівальных матар'ялаў кінуў новае сьвятло на паншчыну ў Беларусі, магістар Ст. Станкевіч першы выказаў беларускі элемэнт у філёмацкіх вершах Я. Чэчата, В. Гадлеўскі даў цэнныя спасьцярогі аб беларускай катахізмоўцы з 1835 году, як столетнім беларускім новым друку, Ул. Талочка ўпяршыню грунтоўна зазнаёміў беларускае грамадзянства з праф. М. Баброўскім, М. Пяцюкевіч даў цэнны артыкул і бібліографію аб вялікім беларускім этнографе М. Нікіфароўскім, адвакат М. Шкялёнак і іншыя далі паважныя рэцэнзіі на розныя навуковыя працы і ўрэшце К. Р—іч, Л. К. і інш. далі некулькі карысных уваг і прычынкаў да беларускай культуры.

Словам, дадатна працавала „Калосьсе“ ў мінулым годзе. Ведама, не адно можна было-б яму закінуць, калі-б так грунтоўна яго прааналізаваць, цэлы рад можна было-б яму паставіць канкрэтных пажаданьняў і г. д. Але робіцца гэта не ў газэтным аглядзе, а да таго — і на сонцы ёсьць плямы. Нам ішло тут аб тое, ці „Калосьсе“ сапраўды пазытыўна пачало сваю працу на ніве беларускай культуры? Вось-жа сьцьвярджаем, што так—і жадаем яму далей памыснай працы і належнага развою.

Кніжнік.

Бацькі Беларусы! Вучэце сваіх дзетак беларускае граматы! Дамагайцеся роднае беларускае школы!

БЕЛАРУСЫ! Падтрымлівайце сваю прэсу. Выпісвайце най старэйшую беларусую газэту „Беларусую Крыніцу!“

U litoŭcaŭ

Prociŭlitoŭskija wystupleńni. Užo ad niekatoraha času ŭ Wilni prawodzicca samaja jaraja ahitacyja prociŭ Litwy. Ahitacyju hetu prawodziać palaki emihranty z Litwy. Pryčyny ahitacyi, što Litwa bytcam praśleduje palakoŭ, swaich hramadzian.

Pieršaje prociŭlitoŭskaje wystupleńnie — wieča i manifestacyja—adbyłosia 5 I. siol. h. U źwiazku z hetym „Viln. Rytojus“ (Nr. 4, 1936) u zaciemcy „Čaho jany chočuć“ miž inšym piša: .. „Dziela taho, što ŭ apošnich niekalkich miesiacach polskija hazety nie nazwali badaj aniwodnaha faktu praśledwańnia palakoŭ u Litwie, — paŭstaje pytańnie, što chočuć asiahnuć arhanizatary prociŭlitoŭskich wiečaŭ i manifestacyjaŭ?

Praŭda, 3.XII.1935 PAT padaŭ sensacyjny kamunikat ab praśledwańni palakoŭ u Litwie, ale padaŭ tolki 2—3 proźwiščy, nie padajučy nijakaj prawieranaj wiestki ab henych bytcam praśledawańniach. Užo tady pastawili my cieły rad pytańniaŭ, ale PAT, tradycyjnym zwyčajem, zamaŭčaŭ. Paśla hetaha ŭsio zacichła, tolki „Kur. Wil.“ paru razoŭ prypomniŭsia, paŭtarajučy niekalki proźwiščaŭ.

Urešcie pakazaŭsia pratest palakoŭ kowienskaj ziamli, tady adbyłasia ich wizyta ŭ wysokaj asoby, dalej pajawiłasia adozwa niejkaha biazimiennaha kamitetu, uznoŭ inšaja adozwa z ćwierdžańniami ab bićci palakoŭ u kaściołach, pa hetym wieča, a ciapier ładzicca manifestacyja.

U źwiazku z hetym, my jašče raz śćwiardžajem, što za apošnija miesiacy wilenskija polskija hazety badaj ničoha nia pisali ad praśledwańni palakoŭ u Litwie Heta śćwierdziŭšy, paŭstaje pytańnie — što chočuć asiahnuć arhanizatary wiečaŭ i manifestacyjaŭ?“

Cikawa ab hetym usim na zakančeńnie adciemić, što na wiečach i manifestacyjach nadta mała možna ŭbačyć intelihiencyi, a bywaje tam pradusim samaja ciemnata.

Cikawaja zabarona. „Viln. Ryt.“ (Nr. 5) prynosić hetkuju sapraŭdy cikawuju wiestku: „13.I. siol. h. Starastwa m. Wilni paklikała da siabie redaktaraŭ časapisaŭ: „Viln. Rytojus“, „Jaunimo Draugas“, „Viln. Aušra“, „Viln. Žodis“ i „Gedimina Pilis“; paklikanym u Starastwie było zajaŭlena, kab ad hetaha času ŭ wilenskaj litoŭskaj presie nia byli ŭžywanyja słowy: „Niezaležnaja Litwa“ i „Wilenski Kraj“; adnačasna było zajaŭlena, što za ŭžywańnie hetych słoŭ časapisy buduć kanfiskawacca“. Jasna, tłumačeńni lišnija.

Беластоцкая старонка.

У нядзелю 15.XII 1935 г. адбыўся ў Беластоку сход работнікаў промыслу суконных фабрыкаў. Прысутных было каля 1.500 асоб. Работнікі нараджаліся, як застасавацца да апошніх дэкрэтаў ападаткаваньня, і справай пасыланьня работнікаў на працу цераз „FunduszPracy“ на вольныя мейсцы ў фабрыкі.

Работнікі выслухаўшы справаздачу сваіх прадстаўнікоў, католрыя былі на канфэрэнцыі ў Ваяводзтве, дзе прымалі ўдзел дырэктар „Funduszu Pracy“ і адміністрацыйныя ўлады. Дырэктар „F. P.“ налягаў на тое, каб далі „вольную руку“ для „Funduszu Pracy“ пасылаць на вольныя мейсцы работнікаў, што мае аблягчыць буджэт, які ў гэтым годзе прыход са складак меў 800.000 зл. а расходу 1.260.000 зл. Прадстаўнікі работнікаў заявілі, што гэтую справу пададуць да агульнага ведама работнікаў.

Работнікі выказалі, што падатак, які маюць браць ад работнікаў нерэальны,бо работнікі працуюць ня круглы год, і іхнія заработкі сягаюць увыш да 145 зл. у месяц, а па адлічэньні страчаных дзён „мёртвага сэзону“ будзе ў граніцах ад 50 зл. да 70 зл. у месяц, а гэткія сумы пабораў хіба-ж не падлягаюць ападаткаваньню.

У другой справе работнікі выказаліся рашуча процíў, — іменна проціў таго, каб толькі цераз „F. P.“ пасылаць работнікаў на вольныя мейсцы працы.

Сход адбыўся ў парадку і ўсе разышліся спакойна. К.С—ч.

Ameryka prociŭ fašyzmu i dyktatury

Prezydent wialikaj amerykanskaj respubliki — Zł. Št. Paŭnočnaj Ameryki—Ruswelt niadaŭna abwieściŭ palityčnuju zajawu ŭsiamu świetu, u jakoj miž inšym śćwiardžaje, što palityka dobraha sužyćcia amerykanskich narodaŭ nia jość užo nadziejaj, ale ŭžo źjaŭlajecca faktam. Ad 1934 h. metaj uładaroŭ, što kirujuć losam Eŭropy, nia jość imknieńnie da sužyćcia i mirnaha ładu. U niekatorych krainach Eŭropy asiahnuta takoje pałažeńnie, jakoje pierakonwaje amerykanskija narody, što militaryzm uściaž raście i tyja narody zbrojacca, kab być hatowym da napadu. Heta ŭsio wiadzie da wialikaj wajny. Narody inšych kantynentaŭ zatrywožanyja tym, što mohuć być napadzienyja ŭładarami“—narodami. Hetyja apošnija wiarnulisia da staroj wiery ŭ prawa mieča i da fantastyčnych wywadaŭ, što jany praznačanyja dziela wykanańnia histaryčnaj misii, što jany nośbity kultury, što jany wučyciali cywilizacyi, a ŭsie inšyja, słabiejšyja narody, pawinny im padlahać.

Supakoj zahrožany. Zahrožany supakoj tymi narodami, jakija imknucca panawać nad druhimi. Zł. Št. Ameryki i ŭsie inšyja amerykanskija krainy paŭstrymajucca ad usiaho, što mahło-b padtrymać u świecie kanflikt. Na wypadak wajny Zł. Št. Ameryki wajujučym dziaržawam ničym pamahać nia buduć, nawat ahraničać wywoz praduktaŭ.

Amerykanskija palityčnyja kruhi henuju zajawu Ruswelta pryniali z wialikim entuzyjazmam i poŭnym jaje pryznańniem.

Hetaja zajawa prezydenta Ruswelta i pryznańnie jaje ŭcełaści ŭ palityčnych amerykanskich kruhoch prawodzić u mižnarodnaj palitycy hranicu, jakaja addzialaje Ameryku ad Eŭropy. A pryčynaj hetamu— fašyzm i ŭsialakija inšyja dyktatury ŭ niekatorych eŭrapejskich dziaržawach, jakija biazustrymku zbrojacca, uciskajuć niedziaržaŭnyja narody i hatowiacca da aružnaha napadu na druhija dziaržawy, kab pašyryć swaje imperyjalistyčnyja ŭładańni.

Z pramowy Ruswelta widać, što haworyć najbolš ab Japonii, Italii i Niamieččynie, bo-ž jany, sapraŭdy, wierać u dzikaje prawa mieča i ŭwažajuć siabie za nośbitaŭ kultury i prapawiednikaŭ cywilizacyi.

Sapraŭdy, pakul buduć isnawać na świecie fašyzm i ŭsialakija inšyja dyktatury, datul u mižnarodnaj siamji sužyćcia nia budzie.

Roznyja wiestki

Z CARKOŬNAHA PAHOSTU.

Pachowiny. Na pieršy dzień prawasłaŭnych Kalad pamior u Wilni protojerej Joann Kraskoŭski, adzin z siaradowišča prawasłaŭnaha duchawienstwa, jakoje spryjaje biełaruskamu adradžeńniu. Niabožčyk amal usio žyćcio pracawaŭ siarod biełarusaŭ, a dziela hetaha dobra wiedaŭ patreby ŭ relihijnym žyćci prawasłaŭnych biełarusaŭ. Na apošnim swaim stanowišču siabry Wilenskaj Duchoŭnaj Kansystoryi prot. Kraskoŭski wielmi prychilna adnosiŭsia da patrebaŭ i damahańniaŭ biełarusaŭ u relihijnym žyćci. Asabliwa prychilnym prot. Kraskoŭski byŭ da biełaruskaj moładzi, dokazam čaho źjaŭlajecca, miž inšymi, fakt padčas niadaŭnaha światkawańnia 15-tych uhodkaŭ Biełaruskaha Studenckaha Sajuzu.

U sprawie biełarusizacyi carkwy prot. Kraskoŭski niaraz kazaŭ pra-

Kanfiskata. Hetaha miesiaca 11 dnia Starastwa m. Wilni skanfiskawała Nr. 2 „Viln. Žodis“ za artykuły: „Kurs nowy — baraćba staraja“ i „U kaściołach Litwy bityja i mardawanyja palaki“. Polskija hazety pišuć, što ŭ abodwych artykułach padanyja niepraŭdziwyja wiestki ab litoŭska-polskich adnosinach.

Крыху да білянсу 1935 г. у Зах. Беларусі.

Не ўспамінаючы аб гадавых звычайных сходах беларускіх арганізацыяў і інстытуцыяў,—да білянсу 1935г оду дадаём наступнае:

12—I Беларускі спэктакль у Вільні.

13—I У БІГіК ёлка для віленскіх беларускіх дзяцей

16—I I-я зборка беларускіх моваведаў у справе чысьціні беларускае мовы.

27—I Канфіската № 4 „Беларускай Крыніцы.“

30—I Віл. Гарадзкі Суд засудзіў на 3 тыдні арышту рэдактара „Новага Шляху“—Казлоўскага.

15—II Белар. вечарына спэктакль у в. Сьвіслачы, Ваўкавыскага павету.

16—II Вечарына ў БСС на карысьць незаможных сяброў Саюзу.

19—II Канфіската 1-й кніжкі часапісу „Калосьсе“ (канфіската Судом не зацьверджана).

23—II I-ы арганізацыйны сход закладчыкаў Беларускага Студэнцкага Т-ва імя Ф. Скарыны.“

24—II Пры Беларускім Навуковым Таварыстве утварылася гістарычная сэкцыя.

24—II Канфіската № 9 „Беларускай Крыніцы“ (канфіската Судом не зацьверджана“)

Канец лютага. Рэдакцыя „Шляху Моладзі“ расьпісала конкурс на апавяданьне з бел. жыцьця ў Зах. Беларусі.

3—III Прапагандная пчалярская ў Вільні вечарына.

6—III Канфіската № 1 часапісу „Новы Шлях.“

17—III Сьвяткаваньне 25-летняга юбілею беларускага тэатру.

25—III Сьвяткаваньне 18-ўгодкаў Абвешч. Незалежн. Беларусі.

28—III Апэляцыйны Суд над рэдактарам „Б. Крыніцы“ — Пазьняком.

Сакавік. Ашмянскае Старастваа зачыніла гурток БІГіК у м. Мураваная Ашмянка.

Красавік. Заснаваліся гурткі БІГіК у в. Лядках (Стаўпецкага п.) і ў в. Навасёлках (Маладэчанскага павету).

Красавік. Пры Віл. Бел. Гімназіі арганізавалася „Х-я дружына беларускіх скаўтаў.“

6—V Беларускія скаўты сьвяткуюць сьвята свайго патрона — Юрага.

11—V Радыёканцэрт беларускага хору Шырмы.

12—V Гадавы Сход Бел. Нац. Камітэту, на каторым прынята ў сябры К-ту „т-ва Пчала“ і выбрана Школьная Камісія і Камісія Помачы Незаможным Беларускім Студэнтам.

26—V Канфіската № 22 „Бел. Крыніцы.“

26—V Канфіската № 23 „Бел. Крыніцы.“

Травень. Хуліганы зрываюць і нішчаць беларускія шыльды ў Вільні, Завальная 1.

1—VI Закончаны матуральныя экзамены ў Віл. Бел. Гімназіі — атрымала матуру 23 беларусы.

2—VI I-я беларуская каталіцкая пілігрымка ў Кальварыю — прымала ўчасьце каля 300 асоб.

5—VI Апэляцыйны суд над рэд. „Бел. Крыніцы“ — Пазьняком.

12—VI Віл. Гарадзкі Суд засуджвае на 2 тыдні арышту і 100 зл. штрафу рэд. „Бел. Крыніцы“ — Пазьняка.

19—VI II-я бел. кат. пілігрымка ў Кальварыю.

26—VI Радыёканцэрт бел. хору Шырмы.

Чэрвень. Гасьціў у Вільні д-р. праф. Тарасэвіч з Амэрыкі.

13-17—VII Экскурсія на воз. Нарач Бел. Студ. Саюзу.

17-20—VII VI Зьезд польскіх гісторыкаў у Вільні. На зьезьдзе выступалі беларусы.

22—VII Генер. Сакратар Кангрэсу Нац. Меншасьцяў д-р. Аммэндэ адведвае бел. паліт. дзеячоў у Вільні.

Ліпень. Бел. спэктакль-вечарына ў Жодзішках.

5—VIII Бел. веч.-спэктакль у в. Харкох, Пастаўскага павету.

18—VIII Тое-ж у в. Лядках, Стаўпецкага пав.

18—VIII Тое-ж у в. Лоцьве, Баранавіцкага павету.

21—VIII Віл. Гарадзкі Суд засуджвае на 3 тыдні арышту і 100 зл. штрафу рэд. „Шляху Моладзі“ — Найдзюка.

2-4 IX XI Кангрэс Нац. Меншасьцяў у Жэнэве без учасьця бел. прадстаўніка.

8—IX Выбары ў польскі Сойм паводле новай выбарнай ордынацыі. Беларусы ад выбараў устрымаліся.

15—IX Выбары ў польскі Сэнат паводле новай выбарнай ордынацыі. Беларусы ад выбараў устрымаліся.

20—IX Віл. Гарадзкі Суд засуджвае на 4 тыдні арышту і 100 зл. штрафу рэд. „Новага Шляху“ — Казлоўскага.

21—IX Бел. веч.-спэктакль у в. Пузырох, Вялейскага пав.

22—IX Тое-ж у в. Падлесьсе, Баранавіцкага пав.

22—IX Ц. У. БІГіК адкідае прапанову КПЗБ аб аб'яднаньні і супрацоўніцтве з камуністамі, аб чым выдае Камунікат.

24—IX Рэзалюцыя Бел. Нац. К—ту аб самаадукацыі ў народных масах.

25—IX Канфіската № 34 „Бел. Крыніцы.“

25—IX Камунікат Ц.К. БХД. аб неўваходжаньні ні ў якія сувязі з камуністамі.

3-5—X На міжшкольных спартовых змаганьнях у сетку ў Вільні беларускія скаўты займаюць 2-е мейсца.

7—X Загад Віл. архіяпіскапа Хвядоса аб навучаньні Закону Божага ў школах у матчынай мове (на тэрыторыі Зах. Беларусі — пабеларуску).

11—X Віл. Гарадзкі Суд засуджвае на 2 тыдні арышту і 50 зл. штрафу рэд. „Шляху Моладзі“ — Найдзюка.

13—X Каяковыя выперадкі школьных вясьлярскіх дружын з учасьцем бел. скаўтаў.

23—X Віл. Гар. Суд засуджвае паэта Ф. Грышкевіча і спартоўца Ю. Кэпеля на 1 мес. арышту і 100 зал. штрафу за выданьне часапісу „Крыгалом,“ сканфіскаванага на пач. 1935 году.

27—X Вечар белар. песьні краязнаўчага гуртка Віл. Прав. Дух. Сэмінарыі.

3—XI Канфіската № 40 „Бел. Крыніцы.“

14—XI Прысуд грамадзкага суду над белар. полёнофіламі Астроўскі контра Луцкевіч з таварышамі.

18—XI Вечар беларускай песьні ў „Ognisku Akademickim“ у Вільні.

21—XI Радыёканцэрт беларускага хору Шырмы.

21—XI Акружны Суд над рэд. Пазьняком.

23—XI Вечарына бел. скаўтаў у чэсьць 15-ўгодкаў Слуцкага паўстаньня.

24—XI У БІГіК. лекцыя д-ра Малецкага — „Мы і наша Бацькаўшчына.“

24 XI У ТБШ лекцыя грам. Шырмы — „Уплывы літаратуры на жыцьцё грамадзянства і адзінкі.“

30 XI У БІГіК урачыстая Акадэмія ў чэсьць 25-лецьця сьмерці белар. этнографа Нікіфароўскага.

1—XII Урачыстае сьвяткаваньне 15 угодкаў Бел. Студ. Саюзу.

15—XII I-ыя беларускія рараты ў Вільні.

26—XII Адчыненьне выстаўкі абразоў і рысункаў бел. мастака Сяргіевіча.

Сьнежань. Зачынены гурток ТБШ у Сьвіслачы, Ваўкавыскага павету.

wasłaŭna-carkoŭnym dziejačam, što treba biełarusam u hetaj sprawie stwaryć adzin supolny front i hetak damahacca swajho naležnaha prawa ŭ carkwie dla biełaruskaj mowy.

U pachowinach prot. Kraskoŭskaha brali ŭčaście mnohija biełarusy, ad imia katorych nad mahiłaj Niabožčyka skazaŭ adpawiednuju pramowu hram. Siarhiej Paŭłowič. Na mahiłu prot. Joanna ŭzłožany pryhožy wianok.

Wiečnaja pamiać!

Z UKRAINSKAHA ŽYĆCIA.

Wystaŭka ukrainskaj narodnaj tworčaści ŭ Kijewie. U budynku kijeŭskaha Histaryčnaha Muzeju ŭ hetym m-cy adkrywajuć wystaŭku ukrainskaj narodnaj tworčaści.

Z hetaha widać, što ukrainski narod u Sawieckaj Ukrainie, pad kamunistyčnym režymam, žywie i tworyć.

Ukraincy ŭ Čechasławaččynie arhanizujucca. U českaj Prazie ukraincy zasnawali nowuju arhanizacyju, jakaja maje abjednywać ukrainskich handlaroŭ, pramysłoŭcaŭ i ludziej wolnych fachaŭ, jakija žywuć u Čechasławaččynie.

Z POLŠČY

Z Sojmu. Pasiedžańni Sojmu, paśla kaladnych świataŭ uznoŭ pačalisia. Haloŭnaj sprawaj ciapier źjaŭlajecca dziaržaŭny budžet, jaki sojmawaja kamisija razhladaje i znajomicca z im, kab pradstawić jaho na plenum Sojmu.

Zakančeńnie dekretnaha času. Dnia 15 h. m. končyŭsia termin wydawańnia dekretami zakonaŭ u ekanamična-haspadarčych sprawach. Ciapier urad budzie realizawać tyja ustawy, jakija ŭ hetaj sprawie wydaŭ Prezydent dekretami.

Trahedyja polskaj wioski. Puławski Instytut u swaim časie abwieściŭ statystyčnyja danyja ab žyćci polskaj wioski. Biare jon pad uwahu haspadarki ad 2 da 50 hektaraŭ.

U 1929 h. u takich haspadarkach prypadała ŭ hod na pražyćcio dla adnoj darosłaj asoby 112 zł., a ciapier prypadaje tolki 44 zł. Hetkaja asoba ŭ 1929 h. mahła ŭ dzień wydawać na žyćcio 31 hroš, a ciapier moža wydać tolki 11 hrašoŭ. Hetkimi woś nizkimi sumami abaznačajecca sučasnaje žyćcio polskaha sialanstwa, jakoje stanowić 75 proc. usiaho nasielnictwa ŭ Polščy.

Z ZAHRANICY

Amnestyja ŭ Sawietach. Hazety padajuć z Maskwy, što hieneralny kamisar biaśpiečnaści Jagoda naradžaŭsia z dyktataram Stalinam ab źmienie nutranaha palityčna-taktyčnaha kursu i dahawarylisia ab patrebie amnestyi dla palityčnych wiaźniaŭ.

Mahčyma, što pa prykładzie niekatorych eŭrapejska-zachodnich dziaržaŭ, dačakajucca amnestyi i palityčnyja wiaźni ŭ Sawietach.

Z wajennaha frontu ŭ Afrycy. Italijanska-abisynskaja wajna ŭ Afrycy biazupynna pradaŭžajecca. Apošnimi časami italijancam užo nia tak udajecca pieramahać abisyncaŭ, jak spačatku. Užo ŭ mnohich wypadkach pabiwajuć abisynay italijancaŭ. Nadowiačy abisyncy adabrali ad italijancaŭ 24 tanki i niekalki kulamiotaŭ. Ciapier abisyncy hatowiacca da wialikaj bitwy — na front wyjechaŭ i sam negus (car).

Francuskaje wojska ŭ Afrycy. Hazety padajuć, što Francyja pačała ŭzmacniać swaje wajennyja placoŭki ŭ Afrycy. Z hetaha niekatoryja dahadywajucca, što i Francyja ŭ kancy wystupić mocna prociŭ Italii.

Raźwiazańnie polska-sawieckaha handlowaha dahaworu. Ad pačatku 1936 h. pierastaŭ abawiazywać polska-sawiecki handlowy dahawor i handal miž hetymi dziaržawami, abniaty hetym dahaworam, spyniŭsia.

Francuska-sawiecki handlowy dahawor. U Paryšy pradstaŭnik Sawietaŭ z pradstaŭnikom francuskaha ŭradu zaklučyli francuska-sawiecki handlowy dahawor, jaki ŭžo abawiazuje.

Francuskaja pazyka sawietam. U źwiazku z zaklučeńniem handlowaha dahaworu paŭstała sprawa ŭ Francyi pazyčki Sawietam u sumie 800 milijonaŭ frankaŭ.

Jak bačym, Francyja haspadarča źwiazywajecca z Sawietami.

Japonija i Niamieččyna. Adna českaja hazeta padaje woś takuju wiestku: — u Berlinie adbywajucca japonska-niamieckija pierahawory ŭ sprawie wajennaha sajuzu prociŭ Sawietaŭ.

U Sawietach źnikajuć prywatnyja haspadarki. Sawieckaja statystyka wykazwaje, što za apošnija 6 hadoŭ źniknuła ŭ Sawietach 5 milijonaŭ samastojnych prywatnych ziemlarobskich haspadarak. Pačataja ŭ 1928 h. kolektywizacyja skasawała ŭžo amal usie prywatnyja haspadarki.

Prysudy śmierci ŭ Sawietach. U Świerdłowsku zasudžany na karu śmierci wicedyrektar i haloŭny buhaltar futranaha trestu. Zasudžanyja ŭ praciahu dwuch hadoŭ rastracili bolš milijona rubloŭ hramadzkich hrošaj. Hrošy wydawali jany na padarožy, pabyt u sanatoryjach i na inšyja pryjemnaści.

Niamieččyna hatujecca da wajny. Francuskija hazety padajuć wiestki ab pryhatawańni Niamieččyny da wajny.

U Niamieččynie nikoli nia było hetulki zbožža, jak ciapier, a chleba niama; nikoli tam nia było hetulki rahataj skaciny— a miasa niama; nikoli nia było hetulki małočnych karoŭ — a małaka niama; nikoli nia było hetulki świniej — a tłuščaŭ niama. Usie hetyja pradukty pierarablajuć niemcy na kanserwy, bo hatowiacca da wialikaj i chiba-ž niedalokaj užo wajny.

Ad taho času, jak Hitler uziaŭ uładu ŭ swaje ruki, u Niamieččynie wydana na wojska 75 milijardaŭ marak. Heta dokazy, što Hitler adkryta hatowicca wajawać.

Z KRAJU

Čyhunačnaja katastrofa pad Wilniaj. Na čyhunačnym šlachu Wilnia—Maładečna, miž Nowaj Wialejkaj i Kienaj, kala paŭstanku Kiwiški, 7 h. m. zdaryłasia krywawa-śmiarotnaja čyhunačnaja katastrofa. Ciahnik wyjšaŭšy z Wilni a hadzinie 11 unočy na 7 kilametry ad N. Wialejki zyšoŭ z rejkaŭ i wahony źmitusiŭšysia pałamalisia. U hetaj katastrofie zabita adna starejšaja žančyna, ciažka ranieny sielanin z Warnianskaj wołaści, jakomu lečačy rany adrezali ŭ špitali nahu, i 25 asob raniena lahčej.

Sudowa-śledčyja ŭłady i palicyja ŭ hetaj sprawie wiaduć śledztwa i treba spadziawacca — pryčynu katastrofy wykryjuć.

UWAHA! UWAHA!

U niadzielu 19 studnia siol. u zali Bieł. Instytutu Haspadarki i Kultury pry Zawalnaj wul. Nr. 1—1 Staršynia Instytutu A. W. HADLEŬSKI pračytaje publičnuju lekcyju na temu

„Pačatki historyi Biełarusi".

Paśla lekcyi charawyja śpiewy biełaruskich narodnych i kaladnich pieśniaŭ i deklamacyi. Pačatak roŭna a hadz. 17-aj. Uchod wolny i biasplatny.

Urad Wilenskaha Addziełu BIHiK.

Пісьмы з вёскі

Патрэба свайго духавенства.

Харкі, каля Варапаева, Пастаўскага пав. У нас у большасьці праваслаўныя, ёсьць крыху і каталікоў, але ўсе беларусы. Праваслаўныя нацыянальна сьведамыя, а каталікі — мала сьведамыя. Ад нас да царквы далёка і *нашыя сяляне* ў цэркву не сьпяшаюцца, бо ў цэрквах каля нас трымаецца расейшчына і ласа заглядае на кліpac польшчына, а беларускага там няма нічога. У царкве поп-маскаль заклікае запісывацца ў польскую ваеннага характару арганізацыю „Стшэлец" і кажа, каб давалі царкоўныя складкі на ўтрыманьне рэдакцыяў расейскіх газэт. Больш наш беларус ад папа-маскаля пачуць нічога ня можа.

Папы завялі ў нас таксу за свае рэлігійныя паслугі — за вянец 50 зл., за паховіны ад 15 да 20 зл., за хрост ад 5 да 10 зл. Нашым сялянам гэта проста не даступна, дык і дзеля гэтага сяляне царкоўнымі справамі зусім перастаюць цікавіцца.

Аднак нашыя людзі не безрэлігійныя — бывае, як прыдзе да нас сьвяшчэньнік беларус, парох з Ласіцы, дык людзей тады поўна ў царкве і каля царквы. Папоў-маскалёў наш народ ня любіць.

Каля нас многа ўжо ёсьць баптыстаў, якія маюць у народзе ўплывы куды большыя за рускіх папоў. Польскія ксяндзы на народ таксама ня маюць уплыву, як і рускія папы.

Словам, ужо ўсім ясна, што для нас беларусаў патрэбнае сваё беларускае духавенства. Міт.

Z Nowym Hodam.

Žodziški, Wialejskaha paw. Ad doŭhaha času ŭ nas uwajšło ŭ zwyčaj spatykać Nowy Hod. U aznačanaje miesca źbiralisia nia tolki siabry miascowych hurtkoŭ Bieł. Inst. Hasp. i Kult. i T.B.Š., ale naahuł biełaruskaja siamja. Rabili składki, chto čym moh, — chto ježaj, chto hrašmi, kab na supolnym „bankiecie" pry siamiejnym stale zapiajać rodnuju pieśniu, skazać biełaruski wierš, pawiesialicca, pažartawać. Tut supolna abhawaіywali, što nam daŭ i što my dali „staromu hodu" i čaho pawinny spadziawacca i što musimo zrabić u „nowym hodzie". Hetak-ža chacieli spatkać i 1936 h.

U Žodzišny hurtok Instytutu sabrałasia kala šeśćdziesiaci asob z Žodzišak, Panižań, Ajćwił, Syčyniat, Dziwiatnioŭ, Chwałkaŭ, Ašmianca, Hajawoha-Hila, Rasła i inšych wiosak i zaścienkaŭ świedamych biełarusaŭ, žadajučych pryniać udzieł u spatkańni Nowaha Hodu.

Ale našaja zhoda i siamiejnaje žyćcio nie spadabałasia miascowaj palicyi, jakaja nam zajawiła, „že wy macie jakiś cel" i zažadała ad nas dazwołu ad Starasty. Dziela taho, što takoha dazwołu my nikoli nia brali i ciapier jaho nia mieli, to zmušany byli razyjścisia.

I tak 1936 h. my nie spatkali.

Učaśnik.

Biełaruskaje pradstaŭleńnie i raźbijaki.

Rasła, kala Žodzišak, Wialejskaha paw. Ciomnych ludziej i kala nas šmat jość, a jak ciomnyja ludzi, dyk jany i dzikija. Stydna pryznawacca, što ŭ ciapierašnija času i ŭ nas dy jość jašče dzikija ludzi, — ale jany jość i swaju dzikaść prajaŭlajuć.

Na druhi dzień Kaladaŭ naš hurtok Bieł. Instytutu Hasp. i Kultury ładziŭ biełaruskaje pradstaŭleńnie i dziela hetaha byŭ naniaŭšy ŭ M. Sobala chatu. Kali sabralisia amataryartysty ładzić pradstaŭleńnie, tady hrupka dzikunoŭ śpiarša ŭ chacie prajaŭlała swajo dzikunstwa, a paśla wybiehli na dwor i adtul pačali kidać praz wokny ŭ chatu kamieńni. Dzikuny nikoha nie pabili, ale narabili šmat škody. Paśla hetaha palicyja śpisała pratakoł i sprawa „končanaja". Zyskiwać straty palicyja radzić haspadaru ad hurtka B.I.H.iK. J—k.

Ad redakcyi: Straty treba acanić i padać pozwu na tych asob, jakija hetyja straty zrabili.

Пісьмо з-пад Хорашчы

(*каля Беластоку*).

Даўно я чытаў сваю родную газэту „Беларускую Крыніцу", бо я быў за межамі нашай роднай беларускай старонкі — я быў у Францыі. Сёлета я вярнуўся з Францыі ў сваю родную вёску. Нідзе я ня бачыў такога мілага краю, як нашая Беларусь. Нідзе няма такой вясёласьці для нашага чалавека, як у сваім родным, беларускім Краю; мова нашая, беларуская для мяне на чужыне заўсёды была мілай і надта-ж хацелася з усімі гаварыць пабеларуску. І сапраўды, нашая, беларуская мова ані чуць ня горшая ад францускай і іншых моваў.

Цяпер я ўжо бяз роднай газэты, якая гуртуе ўсіх беларусаў у адну сям'ю, паказвае дарогу да лепшага заўтра і разносіць славу нашага Беларускага народу, я жыць не магу і адразу выпісваю сабе „Бел Крыніцу". Беластоцкі.

Biełaruski referat.

Budsłaŭ, Wialejskaha paw. Na Nowy Hod u našym hurtku Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury hram. R. Šyrma pračytaŭ referat na temu: „Značeńnie litaratury ŭ žyćci adzinki i hramadzianstwa". Śpiarša hety-ž referat hram. Šyrma čytaŭ u hurtku T.B.Š. u w. Zadubieńni.

Referat byŭ dobry i cikawy, adna zahana, što mała było paświačana miesca dla biełaruskaj litaratury.

Pry hetym treba adznačyć, što ŭ nas hety referat naładžany z wialikimi trudnaściami — palicyja praz cełу dzień nie zhadžałasia i damahałasia specyjalnaha dazwołu ad Starasty. Ab hetym referacie hurtok B.I.H.iK. pawiedamiŭ uładu za 6 dzion raniej i zabarony nia było. Uwiečary kamandant miascowaha pastarunku palicyi daŭsia na ŭwahu i zhadziŭsia, što referat moža adbycca i biez specyjalnaha dazwołu ad Starasty.

Z hetaj pryčyny na referacie nia było stolki ludziej, kolki mahło-b być — było kala 60 asob. Prysutny.

Зьліквідавалі сэрвітут—няма пашы.

Ветхава, Маладэчанскага пав. Нашая вёска мае малыя зямельныя надзелы — батрацкія. Затое мела дасюль вялікі абшар пашы, які надзяліў калісь нашай вёсцы граф Мурычкін. Гэта даўно было. Цяпер зямля, калісь уладаньне Курычкіна, перайшла ў Зямельны Банк, які адсудзіў ад нашай вёскі дасюлешнюю нашую пашу. Бяда цяпер нашым сялянам — зямлі зусім мала, пашы няма, а людзей у вёсцы многа і ўсім жыць трэба. Бядуюць, гаруюць сяляне, шукаюць праўды — судзяцца, але справу прайгралі ў судзе. Бяда і гора ў нашай вёсцы, як разбушаванае мора хвалюецца. Улад. Д.

Da čytačoŭ „Biełaruskaj Krynicy"

HRAMADZIANIE!

„BIEŁARUSKAJA KRYNICA" wydajecca koštam składak i achwiaraŭ jaje čytačoŭ. **Składka: na hod 4 zł., na paŭhodu 2 zł., na try miesiacy 1 zł.**

Wydawiectwa „BIEŁ. KRYNICA" dziela pašyreńnia i pahłybleńnia ŭ biełaruskich narodnych masach nacyjanalnaj, socyjalnaj i palityčnaj świedamaści raspaŭsiudžwaje biełaruskaje drukawanaje słowa — hazety, knižki, brašury i žurnały.

Wydawiectwa „BIEŁ. KRYNICY" dla swaich čytačoŭ wyznačyła premiju ŭ formie knižak na 1936 hod.

Chto pryšle da 1 sakawika 1936 h. składku na cełу hod — 4 zł., toj atrymaje premiju z 4-ch knižak:

1) «КАРОТКІ НАРЫС ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ»—У. Ігнатоўскі,
2) «РОДНЫ КРАЙ» — чытанка для дзяцей Л. Гарэцкай,
3) СЬМЕРЦЬ КАСТУСЯ КАЛІНОЎСКАГА» — М. Машара
і 4) „KAZKA AB RYBAKU I RYBCY" — W. A.

Hrošy treba słać na adras „BIEŁ. KRYNICA", Wilno, Zawalnaja 1—1.

UWAHA. Stałym supracoŭnikam i karespandentam Wydawiectwa hazetu pasyłaje biazpłatna, a tak-ža na žadańnie wyšle i wyšejaznačanuju premiju.

Wydawiectwa „Biełaruskaje Krynicy".

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 2. Wydawiec A. Šutowič